выказвання адлюстроўвае шлях развіцця думкі ў свядомасці таго, хто піша, і ў выніку створаны тэкст дэманструе моўны і маўленчы ўзровень адрасанта.

**Заключэнне.** Пісьмо як від маўленчай дзейнасці патрабуе высокага ўзроўню развіцця творчых здольнасцей, арфаграфічнай і пунктуацыйнай пісьменнасці. Традыцыйна ў працэсе навучання беларускай мове выкананне заданняў у пісьмовай форме накіравана на замацаванне моўных уменняў вучняў і ў асноўным носяць рэпрадуктыўны (дыктанты, спісванне) або часткова прадуктыўны характар (канспект, тэзісы). Кампазіцыйныя ўменні фарміруюцца ў працэсе працы над пераказамі, сачыненнямі і перакладамі. Нягледзячы на тое, што яны адносяцца да творчых прац, на практыцы ўсё ж у сваёй большасці не вызначаюцца камунікатыўнай накіраванасцю. Таму спецыяльныя камунікатыўна арыентаваныя прыёмы навучання, якія суадносяцца з пералічанымі вышэй уменнямі, павінны падкрэсліваць значымасць вывучэння лінгвістычных тэм для рэальных патрэб суразмоўніцтва. Спалучэнне моўных і маўленчых ведаў з іх практычнай рэалізацыяй падвядзе да ўсведамлення неабходнасці авалодання законамі мовы для дакладнага выражэння камунікатыўнага намеру, паспяховага дасягнення мэты камунікацыі і эфектыўнасці маўленчых зносін у розных жыццёвых сітуацыях.

Спіс літаратуры


1. Львов, М.Р. Основы теории речи : учеб. пособие для студентов высш. пед. учеб. заведений / М.Р. Львов. – М. : Академия, 2000. – 248 с.
2. Цікоцкі, М.Я. Стылістыка тэксту / М.Я. Цікоцкі. – Мінск : Бел. навука, 2002. – 223 с.
3. Колшанский, Г.В. Объективная картина мира в познании и языке / Г.В. Колшанский ; отв. ред. А.М. Шахнорович. – 2-е изд. – М. : Едиториал УРСС, 2003. – 128 с.


## ФАРМІРАВАННЕ ПРАФЕСІЙНА-КАМУНІКАЦЫЙНАЙ ЗАРЫЕНТАВАНАСЦІ СТУДЭНТАЎ У МЕЖАХ ВНВК “ФАКУЛЬТЭТ І РЭДАКЦЫЯ” (на прыкладзе спецыяльнасці “Беларуская філалогія. Літаратурная работа ў газетах і часопісах”)


*Г.В. Навасельцава*
*Віцебск, УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”*


Сёння ў журналісцкай дзейнасці відавочнай стала тэндэнцыя да паглыблення канцэпцыі выдання. Газета мае поспех тады, калі знаходзіць сваю інфармацыйную нішу і мэтанакіравана працуе з рэальнай аўдыторыяй. Вызначаецца адметнай аўдыторыяй карпаратыўнае выданне, якое не толькі выконвае прадстаўнічую функцыю, але і ў інфармацыйна-публіцыстычным рэчышчы фарміруе грамадскую думку. Першасная практычная дзейнасць у рэдакцыі карпаратыўнага выдання дазваляе пазнаёміцца са спецыфікай працы журналіста, яе вызначальнымі тэндэнцыямі. Бесперапынная карэспандэнцкая практыка прадугледжваецца для студэнтаў спецыяльнасці 1-21 05 01-07 “Беларуская філалогія. Літаратурная работа ў газетах і часопісах” (3, 4, 5 курсы), праводзіцца на базе рэдакцыі газеты “Мы і час” у межах ВНВК “Факультэт і рэдакцыя” і дазваляе прасачыць фарміраванне прафесійна-камунікацыйнай зарыентаванасці студэнтаў, якія знаёмяцца са спецыфікай працы рэдакцыі, журналіста, літаратурнага работніка, замацоўваюць тэарэтычныя веды і прафесійныя ўменні на кожным этапе навучання.

Рэпазіторый ВДУ

**Матэрыял і метады.** На працягу абодвух семестраў навучальнага года студэнты друкуюцца ў газеце “Мы і час”, вядуць справаздачную дакументацыю. У дзённіку студэнт падрабязна фіксуе ход бесперапыннай карэспандэнцкай практыкі. Для аналізу зместу практыкі за 2010–2011 навучальны год быў абраны параўнальны метад, а таксама сацыялагічныя метады даследавання.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Газета “Мы і час” вызначаецца інфармацыйна-аналітычным зместам і прызначана для студэнтаў і выкладчыкаў. Асноўнай мэтавай аўдыторыяй выдання з’яўляюцца студэнты УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”. Разам з тым газета выступае неад’емнай часткай карпаратыўнай прэсы, садзейнічае павышэнню карпаратыўнай культуры супрацоўнікаў, аб’яднанню калектыву, карыстаецца высокім аўтарытэтам у сваёй аўдыторыі і ў сістэме рэгіянальных выданняў Віцебскай вобласці.

Публікацыі ў студэнцкіх выданнях, арыентаваныя на моладзь, пішуцца больш яркай, жывой, вобразнай мовай, чым у гарадскіх СМІ. Паводле глыбіні раскрыцця тэмы іх можна аднесці хутчэй да інфармацыйных, чым да аналітычных жанраў. Аўтарамі большасці тэстаў выступаюць студэнты, для якіх такая дзейнасць з’яўляецца дадатковай мажлівасцю раскрыць свае творчыя здольнасці, праявіць сябе ў грамадскім жыцці вышэйшай навучальнай установы, звярнуць увагу на тыя тэмы і праблемы, якія цікавяць моладзь. Асноўнымі тэмамі для газеты “Мы і час”, як і для любога студэнцкага выдання, з’яўляюцца вучэбны працэс, навуковае і спартыўнае жыццё, шматлікія культурныя мерапрыемсты факультэцкага і агульнаўніверсітэцкага ўзроўню. Асаблівасці тэматыкі і спецыфіка аўдыторыі абумоўліваюць кампазіцыйную структуру як намару ў цэлым, так і асобных матэрыялаў.

Асноўнымі жанравымі формамі, найбольш запатрабаванымі ў студэнцкай прэсе, выступаюць, безумоўна, інфармацыйныя тэксты. Трэба адзначыць высокую частотнасць ужывання нататкі, рэпартажа, бліц-апытання, інфармацыйнага інтэрв’ю. Найбольш цікавы для студэнцкай аўдыторыі, як і для саміх аўтараў, рэпартажны жанр, які праз свой вобразны характар дае мажлівасць выказваць эмоцыі і ўражанні. Запатрабаваным жанрам не толькі ў студэнцкай прэсе, але і фактычна ва ўсіх сродках масавай інфармацыі, застаецца інтэрв’ю.

Бесперапынная карэспандэнцкая практыка студэнтаў у рэдакцыі газеты “Мы і час” пачынаецца з вучэбна-азнаямляльнай (3 курс), якая становіцца важным этапам падрыхтоўкі будучага літаратурнага работніка рэдакцыі, і працягваецца літаратурна-карэспандэнцкай (4, 5 курсы). Кожны студэнт ва універсітэцкай газеце працуе па індывідуальным графіку, які абавязкова прадугледжвае працу ў рэдакцыйнай установе або па заданні рэдакцыйнай установы за яе межамі не менш, чым дзве гадзіны ў тыдзень.

Па выніках практыкі за 2010–2011 навучальны год кожны са студэнтаў мае публікацыю ў газеце (10 студэнтаў 3 курса, 15 студэнтаў 4 курса, 14 студэнтаў 5 курса), значная частка студэнтаў супрацоўнічае з выданнем пастаянна, што дазваляе ў поўнай меры сфарміраваць і ўдасканаліць практычныя навыкі літаратурных супрацоўнікаў.

На 3 курсе спецыяльнасці “Беларуская філалогія. Літаратурная работа ў газетах і часопісах” прадугледжваецца напісанне нескладаных інфармацыйных матэрыялаў (адлюстраванне культурных і спартыўных з’яў і падзей у жанры заметкі, рэпартажа); набор матэрыялаў; выкананне рэдакцыйных заданняў па падрыхтоўцы фотаматэрыялаў; азнаямленне з вёрсткай газеты.

На 4 курсе спецыяльнасці “Беларуская філалогія. Літаратурная работа ў газетах і часопісах” прадугледжваецца напісанне інфармацыйных матэрыялаў на

Рэпазіторый ВДУ

больш складаныя тэмы (адлюстраванне навуковых, культурных і спартыўных з'яў і падзей у жанры заметкі, рэпартажа, інфармацыйнай карэспандэнцыі, стварэнне інфармацыйнага інтэрв'ю); набор матэрыялаў; выкананне рэдакцыйных заданняў па падрыхтоўцы фотаматэрыялаў; удзел ў вёрстцы газеты; азнаямленне з сакратарскай справай; азнаямленне з методыкай падбору матэрыялаў у нумар; азнаямленне з карэктарскай справай.

На 5 курсе спецыяльнасці "Беларуская філалогія. Літаратурная работа ў газетах і часопісах" прадугледжваецца: напісанне аналітычных матэрыялаў (адлюстраванне агульнауніверсітэцкіх падзей рознай тэматыкі ў жанры аналітычнай справаздачы, аналітычнай карэспандэнцыі, стварэнне аналітычнага інтэрв'ю); набор матэрыялаў; выкананне рэдакцыйных заданняў па падрыхтоўцы фотаматэрыялаў; удзел ў вёрстцы газеты; выкананне сакратарскай справы; удзел у падборы матэрыялаў у нумар; выкананне карэктарскай справы; азнаямленне з рэдактарскай справай.

**Заключэнне.** Вынікам бесперапыннай карэспандэнцкай практыкі, а таксама даследавання інфармацыйнай і аналітычнай спецыфікі газеты "Мы і час" у плыні студэнцкага друку і рэгіянальных, абласных сродкаў масавай інфармацыі стала:

- ✓ узмацненне ў выданні яркай і вобразнай інфармацыйнай плыні (укараненне методыкі напісання сінкрэтычнага рэпартажа; пашырэнне выкарыстання фотаздымкаў, уключаных каментарыяў, элементаў замалёўкі як эфектыўных сродкаў стварэння "эфекту прысутнасці" ў рэпартажным жанры);
- ✓ пашырэнне адной з найбольш перспектыўных методык падачы інфармацыі – дыялагічнага падыходу ў асвятленні тэм і праблем (укараненне методыкі выпрацоўкі пытанняў да інтэрв'ю; укараненне методыкі правядзення сікрэтычнага інтэрв'ю; укараненне методыкі стварэння партрэтнага інтэрв'ю);
- ✓ пашырэнне жанравай палітры выдання (укараненне методыкі напісання каментарыя; укараненне модыкі напісання бліц-апытання; укаранення методыкі напісання аналітычнай карэспандэнцыі);
- ✓ пашырэнне тэматычнай разнастайнасці выдання, якое выконвае прадстаўнічую функцыю ВНУ: газета развівала і працягвае развіваць не толькі адукацыйныя, але навуковыя, навучальныя і культурныя традыцыі ўстановы адукацыі. Разам з тым у выданні пастаянна раскрываюцца новыя тэмы: у юбілейным нумары "Мы і час" (20 лістапада 2010 года) асвятляюцца ў тым ліку гістарычныя падзеі, звязаныя з мінулым універсітэта; у нумары за 29 сакавіка 2011 года прадстаўлены матэрыялы, прысвечаныя Дню яднання народаў Беларусі і Расіі, актуальныя для студэнцкай аўдыторыі.

Спіс літаратуры

1. Градюшко, А.А. Студенческая печать : проблематика, дизайн, язык и стиль : сб. ст. / А.А. Градюшко, В.И. Ивченков, А.К. Свороб. – Минск : БГУ, 2008. – 206 с.
2. Студенческая журналистика : метод. рекомендации / [О.М. Самусевич и др.]. – Минск : БГУ, 2010. – 70 с.

## ФОРМИРОВАНИЕ ВТОРИЧНОЙ ЯЗЫКОВОЙ ЛИЧНОСТИ В ПРОЦЕССЕ ОБУЧЕНИЯ ИНОСТРАННЫМ ЯЗЫКАМ

*Т.А. Пищулина*
*Витебск, УО «ВГУ им. П.М. Машерова»*

Как известно, любая личность является социальным продуктом развития общества и представляет собой определенное целостное образование, сформиро-

Репозиторий ВГУ